# МАЦІ АГРЫПІНА

## З успамінаў А. Карпач, в. Каленікі

Сёлетні год для ўсіх нас адметны тым, што ўжо шэсць дзесяцігоддзяў мы жывём пад мірным небам. Не адно пакаленне вырасла, не бачачы ўзрываў бомб, не гледзячы смерці ў вочы. Тым, каму ў 41-ым было дваццаць год, сёння ўжо больш чым восемдзесят. Вядома, вайна жыве ў кнігах, фільмах, палотнах мастакоў, у строга-скупых архіўных дакументах. Але нішто не заменіць успаміны жывых сведкаў тых страшных падзей. Іх, нажаль, усё менш - і байцоў-ветэранаў, і тых, хто жыў у акупацыі ці парабкаваў у Нямеччыне.

У сваіх ««грандыёзных» жорсткіх, крывавых планах вораг не ўлічыў толькі тое, што спагада, як і непакорнасць - адвечныя рысы характару беларусаў. Мужнасць праяўлялася не толькі на фронце, у партызанскіх атрадах, а і ва ўчынках простых сялянак, якія жылі ў акупіраваных вёсках.

... Гэта было ў пачатку вайны. Невялікую вёсачку Каленікі запаланілі фашысты. Лавілі курэй, раскладвалі на падворках і прыгуменнях вогнішчы.У тыя дні Агрыпіне Карпач, маці траіх дзяцей, смерць двойчы глянула ў вочы.

Фашысты расклалі касцёр непадалёк ад хлява. «Там жа конь! - пранеслася ў галаве жанчыны, - Забяруць!». А без яго сям'ю чакаў голад. Прайшла міма вогнішча і, перш, чым замкнуць дзверы хлява, рашыла кінуць каню корму. Раптам ззаду пачула нечыя крокі. Азірнулася: немец пацягнуў каня за аброць. Яна тузанула аброць да сябе. Той нешта злосна загаргетаў. «Не аддам! - крыкнула і ўбачыла, як вочы фашыста наліліся страшнай злосцю. Ён узняў аўтамат і прыставіў да грудзей жанчыны. «Няхай і заб'е, а каня не атрымае», - яна ўжо не сумнявалася, што фашыст так і зробіць. Хто ведае, колькі хвілін заставалася маці да смерці, але на двары прагучала каманда на чужой мове і фашысты ўскочылі, забегалі. Адзін з іх ускочыў у хлеў і нешта рэзка крыкнуў. Злосна зірнуўшы на кабету, немец выпусціў аброць і выбег у дзверы.

... Пачынаўся ліпень. Варожыя войскі ўжо прайшлі праз Каленікі, фашысты толькі раз-пораз наведваліся, «наводзілі парадак», прызначылі, як і ўсюды, старасту. Аднойчы ранкам, падаіўшы карову, маці Агрыпіна выйшла з хлява і пачула шэпт: «Мамаша, мамаша...» Адкуль ён? Здаецца, з-за вугла гумна. Паціху пайшла туды, і ўбачыла двух маладых хлопцаў у салдацкай форме. «Акружэнцы, - здагадалася маці. - Зусім маладзенькія. Як і мой Ваня, які недзе ваюе». Хлопцы аказаліся з Расіі, збіраліся дабрацца да фронту. «А Божухна! Куды ж вы,

параненыя, дойдзеце?» - забедавала маці. Схавала іх у гумне, дзе былі леташнія салома і сена. Насіла цераз дарогу ў вёдрах ежу, паіла духмяным сырадоем. Варыла адвары з лекавых траў, перавязвала загніўшыя раны чыстымі, мяккімі льнянымі анучкамі. А найперш пераапранула ў сынавую вопратку.У хаце пра байцоў нікому не сказала - гаспадар яе быў строгі і баялася, што адправіць хлопцаў, а дзеці маглі не ўтрымаць таямніцы. Ці разумела, што разыкуе не толькі сабой, але і сям'ёй? Вядома, разумела. Але як магла адправіць іх, параненых, маладзенькіх, нявопытных? І куды адправіць, калі вораг даўно папёр на ўсход?

Салдацікі папраўляліся, расказвалі ёй пра свае сем'і, матуль. Яна ж потым усё шкадавала, што не папрасіла іх напісаць адрасы... Хлопцы ўжо збіраліся ў дарогу, прыцемкамі - маладыя ды неасцярожныя - выбіраліся за гумно, дзе былі вясковыя бульбяныя ямы, трэніраваліся ў хадзьбе. Аднойчы фашысты шнырылі па вёсцы. Маці праз акно ўбачыла, як пайшлі да гумна, дзе хаваліся салдацікі. Яны, мусіць, адчулі небяспеку, перабраліся ў яму. Ратавалі хутчэй не сябе - маці і яе сям'ю. Але іх знайшлі там. Значыць, нехта заўважыў у вечары на ямах.

... Праходзячы пад дулам аўтаматаў міма хаты, хлопцы кінулі развітальны позірк на вокны. Сэрца маці сціснулася ад болю, быццам павялі яе сыноў. Казалі людзі, што іх потым расстралялі пад Хмеліскам...

Вёска чакала расправы. А маці ведала, што расстраляюць яе, а можа і ўсю сям'ю. Толькі расправы не наступіла - карнікі наляталі коршунамі на вёскі потым, калі пачалі дзейнічаць партызаны.

Ці ж мог вораг нас перамагчы, калі ў вёсках нашых і гарадах жылі такія жанчыны, як маці Агрыпіна?

Марыя Драпеза, в. Каленікі,
2004 год.